# У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Вялікае княства Літоўскае ўтварылася ў выніку сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця ў XII – XIII ст. заходніх княстваў Русі і зямель летапіснай Літвы. Усталяванне феадальных адносін на гэтых землях, пагроза знешняй агрэсіі выклікалі імкненне да палітычнай кансалідацыі і ўтварэння дзяржавы. Вялікае княства Літоўскае як раннефеадальная манархія ўзнікла пры князю Міндоўгу (1230-я гады – 1263 г.), які аб'яднаў вакол Навагародскага княства суседнія заходнярускія княствы, землі летапіснай Літвы і паўднёва-ўсходнія літоўскія землі. З палітычных меркаванняў ён прыняў хрысціянства (спачатку праваслаўе, потым каталіцтва), у 1253 г. прыняў тытул караля (каранаваўся ў Навагародку). Палітыку расшырэння тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і ўмацавання адзінадзяржаўя працягвалі вялікія князі Транята (1263 – 1264), Войшалк (1264 – 1267), Шварн (Сварамір; 1267 – 1270), Трайдзень (1270 – 1282), Віцень (каля 1295 – 1316), Гедзімін (1316 – 1341), Яўнут (1341 – 1345), Альгерд (1345 – 1377) і яго суправіцель Кейстут. Паступова ў склад Вялікага княства Літоўскага ўвайшлі ўсе беларускія, большасць украінскіх і частка рускіх зямель: у 1240-я гады Панямонне, у 2-й палове XIII – пачатку XIV ст. полацкія, віцебскія, мінскія, берасцейскія і тураўскія, у 1340 – 1352 гг. валынскія землі, у 1350 – 1360-я гады Падняпроўе, Мазырская і Брагінская воласці, каля 1362 г. Кіеўскае, у 1404 г. Смаленскае княствы і інш. Палітыку ўмацавання і расшырэння тэрыторыі дзяржавы паспяхова працягвалі вялікія князі Ягайла (1377 – 1392), Вітаўт (1392 – 1430). Шляхі і сродкі ўключэння беларускіх зямель у Вялікае княства Літоўскае былі розныя, але пераважалі пагадненні з феадаламі гэтых зямель, зацікаўленымі ў моцнай дзяржаве, здольнай абараніць іх ад знешняй агрэсіі, забяспечыць спрыяльныя ўмовы для гаспадаркі, гандлю і інш. Ва ўстойлівай дзяржаўнай уладзе былі зацікаўлены і гарады, якія цярпелі ад феадальнай анархіі, міжусобіц і знешніх набегаў. Гэтаму спрыяла і феадальная раздробленасць зямель Русі, іх аслабленне ў сувязі з нашэсцем мангола-татар і націскам крыжакоў. На беларускіх і ўкраінскіх землях Вялікага княства Літоўскага быў больш высокі ўзровень развіцця феадальнага грамадства, чым у літоўска-жамойцкіх, таму іх уплыў на ўсе сферы жыцця дзяржавы быў пераважны на працягу ўсёй гісторыі Вялікага княства Літоўскага.

**Палітычнае жыццё.** У ліку найбольш складаных праблем унутранага жыцця Вялікага княства Літоўскага былі разнаэтнічнасць і разнаканфесійнасць, адсюль і нацыянальна-рэлігійныя супярэчнасці. Працэсу цэнтралізацыі дзяржавы перашкаджаў і неаднолькавы ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця розных яе рэгіёнаў.

Пасля Крэўскай уніі 1385 г. і прыняцця літоўска-жмудскім насельніцтвам і вялікімі князямі Вялікага княства Літоўскага каталіцкага веравызнання праваслаўнае насельніцтва і феадалы беларускіх і ўкраінскіх зямель пачалі страчваць сваё манапольнае становішча. Вялікія князі сталі часцей падтрымліваць феадалаў-адзінаверцаў, раздаваць ім землі, высокія пасады, эканамічныя і палітычныя прывілеі. У выніку на беларускіх землях складваліся апазіцыі супраць прысланых велікакняжацкіх намеснікаў, усходнія пагранічныя княствы часам пераха-

дзілі да суседняга Маскоўскага княства. Пастаянная агрэсія з боку Тэўтонскага ордэна, рост апазіцыі на беларускіх і ўкраінскіх землях сталі глебай для саюза ВКЛ з Польшчай. Аднак умовы Крэўскай уніі не задаволілі многіх феадалаў Вялікага княства Літоўскага, якія не хацелі мірыцца нават з частковай стратай самастойнасці іх дзяржавы. У 1386 г. супраць вялікага князя Вялікага княства Літоўскага і караля Польшчы Ягайлы выступілі князі полацкі Андрэй Альгердавіч і смаленскі Святаслаў Іванавіч, у 1389—1392 гг. — князь Вітаўт. Іх барацьба пры падтрымцы беларускіх феадалаў скончылася Востраўскім пагадненнем 1392 г., якое гарантавала самастойнасць Вялікаму княству Літоўскаму, вялікім князем стаў Вітаўт. Ён умацаваў цэнтральную ўладу, далучыў да Вялікага княства Літоўскага Смаленск (1404), Вязьму, Вярхоўскія княствы (бас. Верхняй Акі), Жамайцію (1422) і інш. Прававыя і саюзныя адносіны Вялікага княства Літоўскага з Польшчай удакладнены Віленска-Радамскай уніяй 1401 г., Гарадзельскай уніяй 1413 г. і іншымі актамі. Перамога над Тэўтонскім ордэнам у Грунвальдскай бітве 1410 г. надоўга стабілізавала адносіны з крыжакамі, спрыяла эканамічнаму развіццю Вялікага княства Літоўскага, якое ўсё больш уключалася ў сусветны гандаль у Балтыйскім басейне.

Пераемнікі Вітаўта Свідрыгайла (1430—1432) і Жыгімонт Кейстутавіч (1432—1440), абапіраючыся на розныя апазіцыйныя колы, вымушаны былі раздаваць феадалам эканамічныя і палітычныя льготы. Падобную палітыку яшчэ ў большай меры працягвалі Казімір IV (1440—1492), Аляксандр (1492—1506), Жыгімонт I Стары (1506—1548), Жыгімонт II Аўгуст (1548—1572). Асабістыя і маёмасныя правы праваслаўных і католікаў ураўнаваны прывілеем 1434 г. Прывілей 1447 г. і Аляксандраў прывілей 1492 г. значна абмежавалі ўладу вялікага князя панамі-радай. Але з гэтага часу галоўнай перашкодай развіцця дзяржавы сталі бясконцыя войны з узмацнелым пасля вызвалення ад татарскай няволі Вялікім княствам Маскоўскім, якое абвясціла прэтэнзіі на ўсе славянскія землі Вялікага княства Літоўскага.

У выніку войнаў канца XV — 1-й паловы XVI ст. да Маскоўскай дзяржавы адышлі Вязьма, Масальск, Дарагабуж, Курск, Ноўгарад-Северскі, Бранск, Чарнігаў і інш.

Асабліва ўскладнілі палітычнае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім няўдачы ў пачатку Лівонскай вайны 1558—1583 гг. і агрэсія з боку Турцыі і Крымскага ханства на яго паўднёвых рубяжах. Усё гэта вымусіла Вялікае княства Літоўскае пайсці на саюз з Польшчай, якога дамагалася дробная шляхта Вялікага княства Літоўскага, каб атрымаць такія ж прывілеі і правы, якімі карысталіся польскія феадалы. Магнаты і буйная шляхта Вялікага княства Літоўскага рашуча выступалі супраць такога саюза, але была зацверджана Люблінская унія 1569 г., у адпаведнасці з якой утворана федэратыўная дзяржава — Рэч Паспалітая. Паводле уніі Вялікае княства Літоўскае захавала свой суверэнітэт, мела свой урад, казну, войска, заканадаўства, дзяржаўную мову (беларускую да канца XVII ст.).

Пасля Брэсцкай уніі 1596 г. улады зноў сталі падтрымліваць пераважна уніятаў і католікаў. Каралямі польскімі і вялікімі князямі Вялікага княства Літоўскага з гэтага часу былі: Генрых Валуа (1574), Стафан Баторый (1576—1586), Жыгімонт III Ваза (1587—1632), Уладзіслаў IV (1632—1648), Ян Казімір (1648—1668), Міхал Вішнявецкі (1669—1673), Ян Сабескі (1674—1696), Аўгуст II Моцны (1697—1706, 1709—

1733), Станіслаў Ляшчынскі (1704—1709, 1733—1736), Аўгуст III (1733—1763), Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1764—1795).

Працяглыя разбуральныя войны ў 2-й палове XVII ст., сацыяльныя выбухі, магнацкія міжусобіцы і шляхецкае самавольства сталі прычынай палітычнага і эканамічнага заняпаду дзяржавы. Пасля завяршэння Паўночнай вайны 1700—1721 гг. намецілася эканамічнае ажыўленне. Шляхта і магнаты, зацікаўленыя ў развіцці гаспадаркі, згаджаліся на дзяржаўныя рэформы і нават на абмежаванне свайго права ліберум вета. Слуцкая канфедэрацыя 1767 г. пацвердзіла ураўнаванне правоў некаталіцкай шляхты з каталіцкай. Але супраць абмежавання шляхецкіх вольнасцей, у абарону незалежнасці дзяржавы ад іншаземных уплываў у 1768 г. выступілі прыхільнікі Барскай канфедэрацыі 1768 г. Чатырохгадовы сойм 1788—1792 гг. прыняў Канстытуцыю 3 мая 1791 г., накіраваную на ліквідацыю феадальнай анархіі і стварэнне ўмоў для буржуазнага развіцця. Але і гэтыя прагрэсіўныя рэформы скасаваны ў выніку выступлення Таргавіцкай канфедэрацыі 1792 г.

**Дзяржаўны лад.** Афіцыйна Вялікае княства Літоўскае было феадальнай манархіяй. Улада ў ёй належала вялікаму князю. З XV ст. усё больш важную ролю ў дзяржаўным кіраванні адыгрывала Рада Вялікага княства Літоўскага, якая абмяжоўвала велікакняжацкую ўладу. У XV ст. сфарміраваўся вальны сойм, які да XVI ст. набыў значэнне найвышэйшага заканадаўчага і кантрольнага органа. На ім абмяркоўваліся ўсе агульнадзяржаўныя пытанні: заканадаўства, выбранне вялікага князя, прывілеі шляхты, падаткі, адносіны з іншымі дзяржавамі. На месцах існавалі выбарныя павятовыя соймікі. Асобныя функцыі кіравання ажыццяўлялі маршалак, падскарбі, канцлер, гетман найвышэйшы, намеснікі, ваяводы, старосты, кашталяны і іншыя, якія мелі шырокія правы і паўнамоцтвы. Ніжэйшае звяно ў сістэме кіравання: дзяржаўцы, валасныя старцы і падначаленыя феадалам прадстаўнікі сялян — соцкія, дзесяцкія. Напачатку на беларускіх землях аўтаномнымі аставаліся Полацкая зямля і Віцебская зямля і асобныя княствы (Слуцкае, Кобрынскае, Клецкае і інш.). Вялікія князі гарантавалі непадзельнасць гэтых зямель і княстваў, недатыкальнасць уладанняў і правоў феадалаў і мяшчан.

Ліквідацыя ў 1390-я гады асобных удзельных княстваў, падзел у 1413 г. Вялікага княства Літоўскага на ваяводствы (Віленскае, Трокскае) спрыялі цэнтралізацыі дзяржавы. У выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565—1566 гг. у Вялікім княстве Літоўскім утворана 13 ваяводстваў, у тым ліку Берасцейскае, Валынскае, Віленскае, Віцебскае, Кіеўскае, Мінскае, Мсціслаўскае, Навагрудскае, Падляшскае, Полацкае, Трокскае. Тэрыторыя Прапойшчыны ўваходзіла ў Мсціслаўскае ваяводства. Суды ў Вялікім княстве Літоўскім падзяляліся на замкавы, падкаморскі, земскі, велікакняжацкі і інш. У некаторых мясцовасцях захоўваўся народны традыцыйны копны суд. Крыніцамі права напачатку былі мясцовыя звычаі і судовая практыка, з XIV ст. — велікакняжацкія прывілеі, граматы і лісты, Судзебнік 1468 г. Статуты 1529 г., 1566 г. і 1588 г. былі першымі ў Еўропе сістэматызаванымі зборамі законаў. Эканамічнай асновай дзяржавы была феадальная ўласнасць на зямлю.

Паводле сацыяльнага складу насельніцтва Вялікага княства Літоўскага падзялялася на 2 асноўныя класы: феадалы («людзі шляхецкага роду») і залежныя сяляне

(«людзі простага стану»). Намінальным вярхоўным уласнікам усіх зямель у дзяржаве лічыўся вялікі князь. Саслоўе феадалаў складалася з князёў, паноў, зямян, баяр. З XVI ст. іх сталі называць шляхтай, якая карысталася палітычнымі правамі, падатковымі і гандлёвымі льготамі. Шматлікія прывілеі XIV–XV ст. і статуты XVI ст. заканадаўча афармілі права ўласнасці шляхты на зямлю і маёмасныя льготы, што ўзмацніла яе палітычную ролю і абумовіла залежнасць ад яе вялікага князя. На працягу XVII–XVIII ст. большасць мясцовай шляхты перайшла ў каталіцтва і паланізавалася. Пануючым саслоўем было таксама вышэйшае духавенства, якое валодала зямлёй, сялянамі, гарадамі і мястэчкамі.

**Рэлігійныя адносіны.** Большасць насельніцтва Вялікага княства Літоўскага ў XIII ст. належала да праваслаўнай царквы, літоўцы і жэмайты былі яшчэ язычнікамі. У 1387 г. Ягайла правёў хрышчэнне літоўцаў паводле каталіцкага абраду. Хрышчэнне жэмайтаў расцягнулася яшчэ на стагоддзе. Паступова каталіцкая царква пры дапамозе вялікіх князёў пашырала свае пазіцыі. З 1458 г. праваслаўная царква ў Вялікім княстве Літоўскім мела сваю самастойную мітраполію. У сярэдзіне XVI ст. на Беларусі вялікі ўплыў мела Рэфармацыя ў яе розных плынях: 9 кастрычніка 1596 г. абвешчана Брэсцкая унія — акт аб арганізацыйным аб'яднанні на тэрыторыі Беларусі і Украіны праваслаўнай царквы з каталіцкай.

**Сельская гаспадарка.** Асноўнай ячэйкай сельскагаспадарчай вытворчасці была гаспадарка селяніна — дым. Зямельныя надзелы сялян перадаваліся ў спадчыну. Сяляне адной вёскі складалі грамаду, у агульным яе карыстанні былі паша, лясы і воды. Пераважала трохпольная сістэма земляробства. За карыстанне зямлёй да XVI ст. падданыя сяляне плацілі натуральную рэнту (даніну), пазней — адпрацоўвалі паншчыну, плацілі грашовы чынш.

Сяляне-слугі адпрацоўвалі рэнту ў форме паслуг федалу. Самай нізкай катэгорыяй сялян была чэлядзь. Сярод дзяржаўных павіннасцей — будаўніцтва і рамонт замкаў, дарог, мастоў, шарваркі, сярэбшчына. З XVI ст. феадальнае права ўсё больш абмяжоўвала пераходы «пахожых» людзей ад аднаго феадала да другога, ператвараючы іх у «непахожых» людзей. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права пачата Прывілеем 1447 г., паводле якога свабодныя сяляне ператварыліся ў «айчызных людзей». З канца XV ст. у маёнтках феадалаў узнікаюць фальваркі. Іх пашырэнню спрыяла валочная памера — аграрная рэформа, якая актыўна праводзілася пасля прыняцця «Уставы на валокі» ў 1557 г. Паводле феадальных павіннасцей адрознівалі цяглых сялян, асадных сялян і слуг; акрамя іх былі таксама агароднікі, кутнікі, бабылі і інш.

Вялікае княства Літоўскае часта станавілася арэнай жорсткіх і працяглых войнаў, яго насельніцтва нярэдка пакутавала ад голаду і эпідэмій.

З 1650-х гадоў да пачатку XVIII ст. колькасць насельніцтва Вялікага княства Літоўскага паменшала ўдвая, гарады і вёскі былі спалены і разрабаваны, гаспадарка прыйшла ў заняпад. Гэта вымушала феадалаў часова вызваляць сялян ад паншчыны і пераводзіць на чынш. Да сярэдзіны XVIII ст. гаспадарка Вялікага княства Літоўскага была адноўлена. Пачаўся працэс распаду феадальна-прыгонніцкіх адносін, што выявілася ў дыферэнцыяцыі сялянства, росце таварнасці шляхецкіх гаспадарак, пашырэнні мануфактурнай вытворчасці. Узніклі вотчынныя і каралеўскія мануфактуры, гуты, фабрыкі і заводы, на якіх побач з прыгоннымі

працавалі і наёмныя рабочыя. Прадукцыя прадавалася праз рынак.

**Гарады.** Да XIII ст. на тэрыторыі Беларусі было 35 гарадоў. Да XV ст. рысы гандлёвых і рамесных цэнтраў набылі былыя крэпасці, замкі, асобныя гаспадарскія двары. У XVI ст. узнікла каля 200 мястэчак. У XVII ст. у Вялікім княстве Літоўскім было 757 гарадоў і мястэчак, з іх на Беларусі 42 гарады і 425 мястэчак, якія выконвалі эканамічныя, адміністрацыйныя, ваенныя функцыі, былі цэнтрамі лакальных рынкаў, усё больш уключаліся ў сферу еўрапейскага гандлю.

Па меры ўзмацнення гарады, імкнучыся вызваліцца ад улады і падсуднасці велікакняжацкай адміністрацыі, пачалі дамагацца самакіравання паводле магдэбургскага права. У ліку першых у Вялікім княстве Літоўскім такое права атрымалі Вільня (1387), Брэст (1390), Гродна (1391); да XVII ст. самакіраванне мелі 42 гарады і мястэчкі Беларусі. Найбольшую групу гараджан складалі рамеснікі, аб'яднаныя ў цэхі, гандляры, дробныя і сярэднія купцы.

**Культура і асвета.** Высокая і самабытная культура, што сфарміравалася на Беларусі да ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, стала той асновай, на якой складвалася культура ўсіх яе этнасаў. З часу ўтварэння Вялікага княства Літоўскага беларуская мова лічылася дзяржаўнай і мовай міжэтнічных зносін. На ёй вялося справаводства і судаводства, пісаліся граматы, прывілеі, соймавыя пастановы, летапісы, хронікі, статуты, мастацкія і царкоўна-рэлігійныя творы. На беларускай мове Ф.Скарына надрукаваў першыя ва ўсходнеславянскім свеце 22 кнігі Бібліі (1517—1519) і выдаваў кнігі ў заснаванай ім першай у Вялікім княстве Літоўскім друкарні (1522—1525). Апрача твораў рэлігійнага зместу з XV ст. на беларускай мове стварылася арыгінальная свецкая і перакладная літаратура («Александрыя», «Аповесць пра Трою» і інш.). Вялікую ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці адыгралі рэфармацыйны рух і брацтвы. Высокага ўзроўню ў Вялікім княстве Літоўскім дасягнула кнігадрукаванне. Выдатнымі паслядоўнікамі Ф.Скарыны былі С.Будны, І.Фёдараў, П.Мсціславец. Друкарні дзейнічалі ў Брэсце, Нясвіжы, Вільні, Заблудаве, Мінску, Еўі, Оршы, Магілёве. Выдатнымі прадстаўнікамі культуры Вялікага княства Літоўскага былі В.Цяпінскі, Л.Зізаній, Сімяон Полацкі, браты Мамонічы, браты Вашчанкі, К.Нарбут, Б.Дабшэвіч, М.Сматрыцкі і інш. Пашырэнне асветы і кнігадрукавання спрыяла вызваленню прагрэсіўнай думкі ад царкоўных догматаў (К.Лышчынскі, С.Будны і інш). Першай вышэйшай навучальнай установай у Вялікім княстве Літоўскім была Віленская акадэмія, заснаваная ў 1578 г. З узмацненнем уплыву Польшчы і каталіцызму з канца XVI ст. беларуская мова ў дзяржаўным справаводстве пачала выцясняцца польскай і лацінскай.

Значнага развіцця дасягнула ў XIV—XVI ст. мураванае дойлідства (замкі ў Гродне, Крэве, Лідзе, Вільні, Нясвіжы, Міры, Медніках, Троках і інш., у XIII—XVIII ст. існаваў Прапойскі замак). Склалася нацыянальная разнавіднасць гатычнага стылю (Сынковіцкая, Супрасльская, Маламажэйкаўская цэрквы-крэпасці, Ішкалдскі касцёл). У XVIII ст. развіўся своеасаблівы стыль так званага віленскага барока. Магнацкія замкі і рэзідэнцыі пачалі ператварацца ў палацава-замкавыя ансамблі, будаваліся новыя палацавыя комплексы і гарадскія ансамблі. У выяўленчым мастацтве пераважалі іканапіс, партрэтны і батальны жанры.

Шырока бытавала драўляная разьбяная скульптура, адметная свецкасцю і характарнасцю тыпажу. З пашырэннем кнігадрукавання больш высокага ўзроўню дасягнула графічнае мастацтва. У пісьмовых творах развівалася вершаскладанне, сатыра, эпіграма. Быў пашыраны лялечны тэатр батлейка. У XVI – XVII ст. існавалі так званыя школьныя тэатры. У 1740-я гады узніклі прыгонныя тэатры (Нясвіж, Слуцк, Слонім, Гродна). На мануфактурных прадпрыемствах выраблялiся унікальныя ўзоры прыкладнога мастацтва (шпалеры, слуцкія паясы, урэцкае шкло і інш). Ва ўмовах усё большага нацыянальнага ўціску павялічылася роля фальклору.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай у 1772 г., 1793 г. і 1795 г. паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая і абедзве краіны ў яе складзе — Вялікае княства Літоўскае і Польшча — перасталі існаваць.

*І.П.Хаўратовіч.*

*Друкуецца паводле кн.: Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 184 – 191.*

## На гандлёвых і ваенных скрыжаваннях

З узвышэннем у XIV – XV ст. Маскоўскага княства паміж ім і Вялікім княствам Літоўскім пачалося саперніцтва за першынство на вядомых гандлёвых шляхах, за права на памежныя землі. Многія гандляры актыўна карысталіся водным шляхам па Сожы і Дняпры, які пралягаў і цераз Прапойск. Сярод мясцовых краязнаўцаў ходзіць легенда, што нібыта тут пабываў, калі вяртаўся са свайго вядомага падарожжа «за тры моры», цвярскі купец Афанасій Нікіцін, і быццам ён тут і памёр. Аднак дакументальных звестак, якія пацвярджалі б гэту гіпотэзу, не знойдзена. Кніга ж сібірскага вучонага К.Куніна «За тры моры», выдадзеная ў 1952 г. у Іркуцку і на якую часам спасылаюцца, не можа лічыцца дакладнай крыніцай.

Ваенныя дзеянні, якімі часта завяршаліся тэрытарыяльныя спрэчкі паміж суседнімі княствамі, не аднойчы закраналі і Прапойск.

У 1523 г. абодва бакі дамовіліся пяць гадоў утрымлівацца ад нападу адзін на аднаго. Але, нягледзячы на тое, што «крест есмя меж себя целовали», узаемныя напады працягваліся, што нараджала шэраг скаргаў з абодвух бакоў. І ў кожнай з іх упамінаўся Прапойск: то з яго рабіліся напады, то ён падвяргаўся ім.

А ў дагаворы ад 1527 г. сустракаюцца знаёмыя назвы вёсак. У дакуменце сказана: «...города Пропойска села в Лапичи, в Глубов, в Стиловичи, Папорочичи, Волынцы, Соболи, Абакумовичи, Соловчичи, Чардиновичи, Совиничи великому князю не вступатись». Назвы некаторых з пералічаных вёсак зберагліся да нашых дзён, што дазваляе больш-менш дакладна вызначыць тагачасную ўсходнюю мяжу Прапойскай воласці: яна праходзіла ў 20 – 40 км па тэрыторыі цяперашніх Чэрыкаўскага і Краснапольскага раёнаў.

Апрача войнаў нашы продкі цярпелі і ад прыродных катаклізмаў. У 1592 г. і 1601 г. іх напаткаў страшэнны голад, які ў 1601 г. дапоўніўся і ранняй лютай зімой, што яскрава апісана ў Баркулабаўскім летапісе.

XVII ст. вызначалася пастаяннымі войнамі паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, казацкімі паўстаннямі, ад якіх моцна цярпела мясцовае насельніцтва. Прапойск то заваёўваўся расійскімі войскамі, то адбіваўся праз пэўны час назад. Асабліва трагічныя вынікі для Беларусі мела вайна 1654 – 1667 гг. У час яе быў разбураны Прапойскі замак. Навакольныя вёскі былі спустошаны, многія жыхары загінулі, трапілі ў палон ці разбегліся. Зямля пуставала, зарастала лесам. Падпісанае 30.1.1667 г. у в. Андрусава (каля Мсціслава) перамір'е паклала канец вайне. Прапойскае староства засталося ў складзе Рэчы Паспалітай, якая ў далейшым стала выступаць саюзніцай Расіі.

Так было, напрыклад, у час Паўночнай вайны 1700 – 1721 гг., калі Рэч Паспалітая і Расія выступалі супраць Швецыі. Арэнай баявых дзеянняў зноў сталі беларус-

кія землі, і асабліва Магілёўшчына. Тут адбылося некалькі бітваў, адна з якіх — пад Лясной, на тэрыторыі цяперашняй Слаўгарадчыны. Паўночная вайна прычыніла беларусам вялікія страты: загінула шмат людзей (па некаторых звестках — кожны трэці), былі спалены, разбураны ці разрабаваны многія населеныя пункты.

*А.П.Ерашэнка, П.С.Ерашэнка.*

## Прапойская воласць

Прапойская воласць (Прапойскае староства) — буйны дзяржаўны маёнтак у Вялікім княстве Літоўскім. З пачатку XVI ст. кіравалася намеснікамі, якім звычайна належала адначасова і суседняя Чачэрская воласць. Намеснік падпарадкоўваўся віленскаму ваяводзе. На пасадзе намесніка прапойскага і чачэрскага ўпамінаюцца Я.Няміра (1510—1511), М.Юр'евіч (1514), С.А.Чартарыйскі (1518—1524), Ф.М.Вішнявецкі (1526—1529), А.І.Дашкавіч (да 1535), І.М.Вішнявецкі (1536—1543), Ю.В.Насілоўскі (1543—1544). У 1511 г. сяло Лобча са складу Прапойскай воласці падаравана ў пажыццёвае валоданне князю М.І.Мсціслаўскаму, у 1529 г. зноў далучана да Прапойскай воласці. У размежаванні з Маскоўскай дзяржавай у 1526 г. упамінаецца шэраг сёл Прапойскай воласці, у якія не павінна «ўступацца» Масква, у т.л. размешчаныя цераспалосна з суседнім Крычаўскім староствам (Галоўчыцы, Чудзінавічы, Савінічы). З 1547 г. воласць перададзена ў заклад Ю.Зяновічу. Паводле адміністрацыйнай рэформы 1565—1566 гг. уключана ў Рэчыцкі павет Менскага ваяводства (ізаляваныя анклавы Прапойскай воласці, верагодна, адносіліся да Аршанскага павета і Мсціслаўскага ваяводства). Асноўнай часткай воласці да 1590 г. кіравалі Зяновічы, потым — Солтаны, Служкі, Красінскія, Заронкі, Незабытоўскія, Сапегі, Храптовічы, Масальскія, Бжастоўскія, Насілоўскія, якія насілі тытул намесніка (старосты). Некаторыя паселішчы (Азёры, Чудзінавічы і інш.) былі вылучаны ў асобныя староствы. У верасні 1772 г. Прапойская воласць далучана да Расійскай імперыі, неўзабаве падаравана Кацярынай II князю А.Галіцыну, пасля чагоператварылася ў прыватны маёнтак.

*В.Л.Насевіч.*

* * *

Паводле рэестра збірання падаткаў за 1675 г. у Прапойскім старостве значыцца 25 населеных пунктаў.

У 1675 г. у Прапойску налічвалася 58 гаспадароў, якія плацілі чыншу 373 злотыя і 13 грошаў. Вось іх прозвішчы — Андрэй Лаўшоў, Іван Шыш, Сукач Астапаў, Фрэцік Укулоў, Лявон Зыбко, Дзяніс Мікры, Сцяпан Ракбін, Цімох Падвайшчэня, Грышка Укулоў, Андрэй Падвойскі, Карп Палуба, Талалан, Таратуда, Ціхан Дзяско, Цімох Мікрыя, Півавар, Карп Поп, Цемніка, Кандрат Цыган, Аніска Поп, Сямён Філіповіч, Іван, ён жа Васіль Барсук, Зражэнскі, Отрах Макенін, Арэндар, Холіс, Сыман Шрот, Майсей Шротаў, Алесь Поп, Жаксары Карабін, Халіс Шротаў, Андрос Атоніч, Харытон Паўлікаў, Мехед Алісаў, Аляксей Зыроў, Крычовец, Астап Г[Х]рыловіч, Яцка Алёніч, Мікалай Дзенісовіч, Войцешка, Маёр Жыд, Набока, Восіп Поп, Мікіта Піліповіч, Давід Яўстратаў, Кабылінскі, Карней Асташкоў, Гардзей, Даніла Косцін, Сіла Чырок, Етарым Ешчанок, Ціхан Поп, Панцялей Шчучка, Ірка Занкоў, Ігнат Лысы, Грышка Корзун, Даніла Поп, Клім Яшкевіч.

У інвентары за 1681 г. тэрыторыя Прапойскага староства падзелена на дзве часткі: воласць староства Прапойскага над ракой Сожам (вёскі: Жаролы, Васькавічы, Урэчча, Устаннае, Чыкаўка, Хварасцяны, Шаламы) і воласць староства Прапойскага за ракой Проняй (сяло Лобча, вёскі: Дуброўка, Рынкаўка, Палоскі, Прыпёкіна, Слабада, Палуж, Бімле, Пабале, Абакунавічы, Дубна, Валынцы, Чудзін, Горні, Галоўчын). Паводле інвентара 1750 г. (НГАРБ. Ф. 694. Воп. 4. Інв. 1556. Л. 218—229б) усяго ў Прапойскім старостве налічвалася 47 населеных пунктаў, 739 дымоў (двароў) і плаціла староства падатку 204 злотыя і 7 1/2 гроша. Прапойск налічваў 86 двароў праваслаўных і 14 двароў яўрэйскіх жыхароў, вёскі Шаламы з Урэччам — 37 двароў, Васькавічы — 24, Чыкаўка — 8, Хварасцяны — 21, Устаннае — 9, Ржаўка — 10, Дуброўка — 12, Намільня — 15, Хоўмы

Слабада (сучаснае урочышча Хоўмы, каля в. Любаны ў Гіжэнскім сельсавеце) — 3, Рудня (сучасная вёска ў Васькавіцкім сельсавеце) — 9.

У 1750 г. у Прапойскім старостве налічвалася 11 млыноў. Рыбная тоня ў 1681 г. была на воз. Пішчанае.

Калі князь А.М.Галіцын атрымаў пасля далучэння ўсходняй Беларусі да Расіі Прапойскае староства, у ім было 32 карчмы, з іх 11 — у Прапойску.

*І.Я.Яшкін.*

## Прапойскі замак

Існаваў у XIII—XVIII ст. З'яўляўся цэнтрам абароны сярэдневяковага Прапойска (з 1945 г. Слаўгарад). Займаў выцягнутае з поўначы на поўдзень гарадзішча (95х40 м) старажытнага Прупоя, ці Пропошеска, якое размяшчалася на стромкім беразе Сожа, недалёка ад упадзення ў яго р. Проня.

Прапойск праходзіў доўгі этап фарміравання як горад, што адбівалася і на структуры яго ўмацаванняў. Спачатку тут быў абарончы частакол, з XII ст. — невялікі вал вышынёй 1 м і шырынёй 4 м у аснове, на вяршыні якога стаяў дубовы частакол. У XIII ст. вал падсыпалі на 2 м, расшырылі яго аснову і паставілі на ім зрубленыя сцены. Пляцоўкі пасада, што разросся пад аховай дзядзінца, да XIV ст. стала ўжо не хапаць. Горад перасягнуў заходні абарончы роў і пачаў развівацца на суседнім узвышшы. Паводле гістарычных крыніц, у XIV—XVII ст. замак і горад мелі драўляныя ўмацаванні, узводзіць і рамантаваць якія абавязаны былі жыхары «места Пропойского с волостью». Як і іншыя парубежныя гарады Пасожжа, Прапойск разам з воласцю спачатку адносіўся да велікакняжацкіх зямель, якімі кіравалі намеснікі, потым знаходзіўся ў «держаньи» ў спецыяльна назначаных вялікім князем дзяржаўцаў — старостаў. Яны павінны былі сачыць за станам і рамонтам умацаванняў, клапаціцца пра ўтрыманне гарнізона і ўзбраенне. Паводле гістарычных крыніц, намеснікам Прапойска ў 1518 г. быў князь Сямён Андрэевіч Чартарыйскі. У грамаце вялікага князя Вялікага княства Літоўскага і караля Польшчы Жыгімонта І Старога ад 29.12.1518 г. указвалася, што намеснік «...срубил нам у Пропойску замок тамошними людьми нашими Пропойчичаны и Чычераны, а к тому своим накладом збудовати нам ся поднял». За такую значную паслугу кароль задаволіў чалабітную князя аб перадачы яму ва ўтрыманне гэтых зямель. У ваенны час у Прапойскім замку быў невялікі пастаянны гарнізон з 10—20 казакоў на чале з ротмістрам. Гарнізон і замак існавалі за кошт часткі прыбыткаў са староства. Паводле велікакняжацкага распараджэння, у шэрагу парубежных гарадоў, у тым ліку і ў Прапойску, з 1561 г. пачалі трымаць дадатковыя «почты» коннікаў. Яны былі ўзброены найноўшай ручной агнястрэльнай зброяй — «губчастымі ручніцамі», якія цэнтралізавана пастаўляліся сюды з Вільні разам з амуніцыяй і гакаўніцамі. Ахова замка і воласці, акрамя казакоў, ляжала і на мясцовых баярах, што неслі конную службу «на самом рубеже». Першае ўпамінанне пра артылерыю ў Прапойскім замку адносіцца да 1529 г., калі староста прапойскі і чачэрскі даставіў у Вільню гараднічаму «спижи от дела горелое на замку Пропойском». У сувязі з вострай нястачай сыравіны дастаўка на Віленскі пушкарскі двор старых, гарэлых і пашкоджаных медных гармат для рамонту і пераплаўкі з'яўлялася абавязковай умовай. Дакладная колькасць пушкароў у Прапойскім замку ў XVI—XVII ст. невядомая (у дакументах за 1576 г. называецца пушкар Міхаіл Лімоўскі). Тут іх, відаць, было некалькі, як і ў суседніх Крычаўскім і Чачэрскім замках. Велікакняжацкая ўлада пастаянна трымала ў полі зроку парубежны Прапойскі замак і для кантролю за яго станам і справамі пасылала спецыяльных рэвізораў і «справцов господарских». З іх перапіскі з вялікім князем і з дакументаў за 1564 г. відаць, што ў Прапойскім замку былі драўляныя вежы і сцены, абмазаныя глінай «до бланкованья», вежа-брама і пад'ёмныя масты-«ўзводы». Адзін з мастоў быў перакінуты цераз заходні абарончы роў і, відаць, упіраўся ў праезную вежу. У 1564 г.

«справца» Б.Ц.Пузына дакладваў вялікаму князю Вялікага княства Літоўскага і каралю Польшчы Жыгімонту II Аўгусту, што «господарский замок Пропойск на колку месцах велми опал и не обмазан, ворота и взводы потребуют лепшего поправленя». Звесткі пра колькасць вежаў у Прапойскім замку адсутнічаюць. Аднак паводле яго планавай структуры можна меркаваць, што на перадграддзі і пры ўездзе ў замак стаяла па адной вежыбраме, а з боку поля — вуглавая «кутная вежа». Па грэбені вала, які ішоў у паўднёвым напрамку, над абарончым ровам размяшчаліся замкавыя гародні. Яны ўпіраліся, відаць, на вуглу ў паўднёвую вежу. Своеасаблівы выступ у лініі гародняў, якія мелі даўжыню каля 100 м, дае падставу меркаваць пра існаванне яшчэ адной, прамежкавай вежы. З поўдня і ўсходу замак прыкрываўся стромкім 20-метровым абрывам у бок Сожа. Дзякуючы выключнай прыроднай умацаванасці вежаў тут не было, хаця інвентар замка XVII ст. называе «форту у паркане до воды». Пасля разбурэнняў у вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. горад і замак доўга не маглі дасягнуць ранейшага стану. Аднак Прапойскі замак, відаць, усё ж не страціў свайго ваеннага значэння. Інвентар за 1681 г. зафіксаваў замак як невялікае ўмацаванне, абгароджанае «палямі». Згадваюцца «брама, дранцами крытая», «форта у паркане до воды», жылыя і гаспадарчыя пабудовы (хаты белыя, піўніца, 2 свіраны, сыраварня, пякарня, 3 стайні, лазня, шопа). Перад замкам быў вялікі агарод, абнесены «дылями». Вакол горада былі «городьба» і «брамы», якія, як і «паркан замковый», ставілі жыхары Прапойска і воласці. У 1681 г. у горадзе толькі 104 двары. У канцы XVII — пачатку XVIII ст. у выніку хуткага развіцця артылерыі і фартыфікацыі Прапойск страціў сваё стратэгічнае значэнне ў Пасожжы на мяжы з Расійскай імперыяй, што поўнасцю пацвердзілася ў Паўночную вайну 1700—1721 гг. Аднак яшчэ ў 1780 г. тут упамінаўся «замок, окруженный полисадом». Пасля далучэння усходняй Беларусі да Расійскай імперыі (1772) Прапойск быў падараваны Кацярынай II князю А.М.Галіцыну. У канцы XVIII ст. у выніку праведзенай князем на пляцоўцы замчышча планіроўкі зніклі абарончыя валы і рэшткі старажытнага замка, якія цяпер можна прасачыць толькі шляхам археалагічных даследаванняў.

*М.А.Ткачоў.*

## Манетныя скарбы, знойдзеныя на тэрыторыі Слаўгарадскага раёна

**Вёска Вялікая Зімніца**, знойдзены ў 1959 г., 93 экзэмпляры (2 капейкі, 5 капеек Расіі; медзь), ухаваны ў 1800 г.; **в. Ганчароўка**, знойдзены ў 1947 г., каля 200 экзэмпляраў (капейка Расіі, трайныя грошы, орты Рэчы Паспалітай; серабро), ухаваны ў XVII ст.; **в. Добры Дуб**, знойдзены ў 1910 г., 91 экзэмпляр (2 капейкі, 5 капеек Расіі, шасціграшовікі, трыццаціграшовікі, орт Рэчы Паспалітай, шасціграшовікі Прусіі; медзь, серабро), ухаваны ў 1771 г.; былая **в. Зімніца**, знойдзены ў 1940 г.; 78 экзэмпляраў (грошы Чэхіі, серабро), ухаваны ў XV ст.; **вярхоўі р. Пясчанка**, знойдзены ў 1-й пал. 1920-х гадоў, 1 экзэмпляр (дэнарый Германіі, серабро), ухаваны ў XI ст.; **в. Папоўка**, знойдзены ў 1915 г., 1 экзэмпляр (дырхем Арабскага Халіфата; серабро), ухаваны ў X ст.; **в. Ржаўка**, знойдзены ў 1906 г., 125 экзэмпляраў (грошы Чэхіі; серабро), ухаваны ў XV ст.; **в. Рабінаўка**, знойдзены ў 1867 г., 762 экзэмпляры (сярэбраныя манеты); **г. Слаўгарад**, знойдзены ў 1911 г. (медныя і сярэбраныя манеты); знойдзены каля 1928 г. (шасціграшовікі Рэчы Паспалітай; серабро), ухаваны ў 4-й чвэрці XVII ст.; знойдзены ў 1962 г., 1 экзэмпляр (талер Заходняй Фрызіі, кантрамаркіраваны ў Маскве; серабро), ухаваны ў XVII ст.; былая **в. Стан**, знойдзены ў 1894 г., 7 экзэмпляраў (орт Рэчы Паспалітай, паўталер, талер Іспанскіх Нідэрландаў, талеры Злучаных Правінцый; серабро), ухаваны ў 1648 г.

## Дакументы сведчаць

### ПРЫВІЛЕЙ ЖЫГІМОНТА І СТАРОГА ЖЫХАРАМ ПАДНЯПРОЎСКІХ І ПАДЗВІНСКІХ ВАЛАСЦЕЙ

**2 кастрычніка 1511 г.**

Жикмонт, Божьею милостью король и великий князь. Чиним знаменито сим нашим листом, што перво сего многократ жалобы приходили к нам з волостей наших Поднепрьских и Задвинских, то есть, с Кричова, с Пропойска, с Чечерска... с Горволя, з Речицы, с Брягина, з Мозыра, з Бъича, з Бобруйска, с Свислочи, з Любошин, с Усвята, с Озерищ, с тыми разы били нам чолом вси тых волостей наших данники, иж им тяжкость великия ся деет, не только в нынешние валечные часы, от тых, которых то коли посылаем на службу нашу, штож кладучыся промежку от волостей войском, их пицуюць и грабят; а наболей отяжають собе от писарей наших, которых то посылаем по тым волостем нашим недополыков даней наших правити, иж слуги их, от году до году, не выезжаючи на тых волостех мешкають, корчмы сытят для своего пожитку, а волости наши мусят им на каждую неделю страву давати грошми и стацеею, и по нескольку сторожов, и к тому судят их и рядят, и вины великие на них беруть; а и сами писари наши възъехавши на волости, непомерные въезды и стацеи на них то беруть, и для своих присудов и вин на каждой волости мешкаюць по кольку недель, а она их стравовать мусят; а так, с того великого драпежства и грабежу, многие данники наши с тых волостей наших разошлися, а тыя, которые ся еще остали, не только сполна дани нашое, але и половицы, от колька лет вжо, в каждый год не могут заплатити. И били нам чолом вси тых волостей наших данники наши, абыхмо их при старине заставили, как бывало за предков наших, за великого князя Витовта и Жикгимонта, иж они собравши дань грошовую, и бобры и куницы, отношивали до скарбу нашого, а мед пресный до ключа; и подвязалися нам тым обышто всю тую дань нашу, грошовую и медовую и бобровую и куничную, мають нам относить до скарбу и до ключа нашого, всю сполна, подле стародавнего обычая, на роки звычайныи, а то есть первый рок Божье Нароженье, другой Середопостье, третий Великдень; а подвязалися нам тым обычаем: если бы на тые вышейписаные роки всее сполна дани нашое... до скарбу и ключа нашого не отнесли, тогда мает подскарбий наш нынешний пан Аврам Езофович и по нем будучи подскарбии, после Великодня, ничого не мешкаючи, послати децких своих и туго дань нашу на них справити, с винами нашими и з децкованьем их. Мы с паны радами нашими помысливши о том и бачучи их слушную прозьбу, которая ж есть з нашим пожитком тым есмо пожаловали: от тых часов вжо, писари наши не маюць к ним для недополыков дани нашое въезжати и туго дань правати, а ни слуги их; мають они сами, на тые вышейписаные роки, дань нашу грошовую и медовую и бобровую до скарбу и до ключа нашого отнести, а ежли бы на тые вышейписанные роки не отнесли, тогды мает подскарбий наш слуг своих на вси волости послати, и они, ехавши, мають дань нашу и недополыки на волостях справати з децкованьем, и теж доход канцелярский; а мы особно маем их за то винами нашими карати. Також и доход писарский, то есть, взъезд их и тивунщину, то все мають до скарбу нашого сами относити: занеж в то от тых часов, и тивунове по свой доход не мають к ним въезжати. Також што перед тым по тым волостем нашим писари або державцы, то есть наместники и тивунове тых волостей корчмы на себе сычивали: по та места вжо, как державцы так и писари наши и тивуны корчом сытити не мешають; мы берем тые корчмы к нашей руце: где ся нам на которой волости увидит корчмы мети без шкоды данников наших, там кажем корчмы сытити, а плат их до скарбу нашого носити.

Сталося и дано на великом сойме Берестейском, лета Божьего тысяча пятьсот первого на десять, месяца октября 2 дня, индикта 15.

*Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею (1506—1544). СПб., 1848. Т. 2. С. 99.*

### ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА І КНЯЗЮ ЧАРТАРЫЙСКАМУ НА ПАЖЫЦЦЁВАЕ ЎЛАДАННЕ ПРАПОЙСКАЙ І ЧАЧЭРСКАЙ ВАЛАСЦЯМІ

**29 снежня 1518 г.**

